кинопродукции, способствующей патриотическому воспитанию молодежи через демонстрацию подвига и самопожертвования советского народа ради победы.


**Источники**

1. Автухович, Т. Е. Вторичная мифологизация Великой Отечественной войны в современном российском кино / Т. Е. Автухович // Культ-товары. Коммерциализация истории в массовой культуре / сост.: М. П. Абашева, М. А. Литовская, И. Л. Савкина, М. А. Черняк – М. ; Екатеринбург, 2020. – С. 224–241.

2. Ксенофонтов, В. В. Культура русского мира – слагаемое духовного фактора победы в Великой Отечественной войне (социально-философский анализ) / В. В. Ксенофонтов // Социальнополитические науки. – 2020. – Т. 10, № 2. – С. 169–173.

3. Кувшинов, Д. Ю. Искажение исторических фактов о Великой Отечественной войне в современном игровом кино / Д. Ю. Кувшинов // Вестн. обществ. и гум. наук. – 2020. – Т. 1, № 4. – С. 11–14.

4. Мурадов, А. Б. Современный герой в хронотопе военного времени / А. Б. Мурадов, К. А. Шергова // Вест. ВГИК. – 2017. – Т. 34, № 4. – С. 37–50.

5. Роль фильмов о Великой Отечественной войне в воспитании патриотизма современной российской молодежи / Ю.А. Давыдова, Е. В. Каргаполова, С. А. Алексеева, Е. С. Шпаковская // ЦИТИСЭ. – 2021. – Т. 29, № 3. – С. 24–34.



***А.У. Кімбар**, выкладчык*
*МДПК (Мінск)*


## МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ СТАЛІЦЫ ЯК СКЛАДНІК ВЫХАВАЎЧАЙ ПРАСТОРЫ КАЛЕДЖА

У сучаснай выхаваўчай сістэме ўсе большая ўвага надаецца рабоце з музеямі. Так, у адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, наведванне музеяў з'яўляецца фактарам, які спрыяе развіццю ў вучняў цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, фарміраванню пачуцця любові і прыхільнасці да малой радзімы [4, с. 9]. Пры гэтым, даследчыкі ў галіне музеязнаўства падкрэсліваюць, што сярод усіх функцый музея выхаванне і адукацыя асобы з'яўляюцца прыярытэтнымі відамі дзейнасці разам з захоўваннем, вывучэннем і экспанаваннем музейных прадметаў, таму што грамадства мае патрэбу ў мэтавай, аўтэнтычнай, добра структураванай і даступнай для ўспрымання інфармацыі [7, с. 112].

У апошнія гады ўключэнне работы музеяў устаноў адукацыі ў сістэму выхавання моладзі становіцца адным з важных напрамкаў дзейнасці. Так, у маі 2023 г. міністр адукацыі А.І. Іванец на рэспубліканскім форуме музеяў устаноў адукацыі адзначыў, што «музеі ўстаноў адукацыі сення – гэта не толькі сховішчы ведаў пра матэрыяльную і нематэрыяльную культурную спадчыну, але і важнейшы фактар выхаваўчай ролі адукацыі, адукацыйны цэнтр, дзе гістарычная і культурная спадчына, пакінутая папярэднімі пакаленнямі, вывучаецца, даследуецца і папулярызуецца навучэнцамі» [8]. У адпаведнасці з такімі тэндэнцыямі ўсе больш актуальнай становіцца музейная педагогіка. У сучаснай айчыннай педагагічнай навуцы музейная педагогіка разглядаецца як вобласць навукова-практычнай дзейнасці, якая мае тэндэнцыю да самаразвіцця ў інтэграваную вобласць ведаў, памежную з музеялогіяй, педагогікай, псіхалогіяй, сацыялогіяй і культуралогіяй і з'яўляецца асновай рэалізацыі культурна-адукацыйнага патэнцыялу музея [5, с. 4].

Музеі ўстаноў адукацыі становяцца часткай выхаваўчай прасторы. Да вызначэння паняцця выхаваўчай прасторы ў даследчыкаў існуе некалькі падыходаў. Так, А.А. Глінскі і Н.М. Захожая, падсумоўваючы розныя напрамкі даследаванняў дадзенай праблематыкі, вызначаюць, што выхаваўчая прастора ўяўляе сабой мноства ўзаемазвязаных педагагічных падзей, арганізаваных не толькі ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі, але і іншымі сацыяльнымі суб'ектамі: установай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, бібліятэкай, тэатрам, музеем, установай аховы здароўя, спорту і г.д. [3, с. 4].

23 жніўня 2024 г. у Мінскім гарадскім палацы культуры прайшоў Мінскі гарадскі адукацыйны форум педагагічных работнікаў «Якасная адукацыя сення – паспяховая будучыня заўтра», у час правядзення якога працавала выставачная экспазіцыя «Якасная адукацыя: мінскі стандарт» [6]. На дадзенай выставе кіраўніцтвам і выкладчыкамі Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа ажыццяўлялася прэзентацыя гісторыі сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі (далей – ССПА) сталіцы на аснове віртуальнага музея Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа, навуковых прац выкладчыкаў і навучэнцаў каледжа і матэрыялаў архіва камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.

ССПА г. Мінска мае багатую гісторыю. У 1921 г. пачаў сваю працу Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум (далей – Белпедтэхнікум) – навучальная ўстанова, якая рыхтавала спецыялістаў не толькі для сталіцы, але і для ўсей БССР. У красавіку 1937 г. Белпедтэхнікум быў перайменаваны ў педагагічнае вучылішча. У 1998 г. сярэднія спецыяльныя педагагічныя ўстановы сталіцы атрымалі статус каледжа. У 2004 г. работа педагагічных каледжаў № 1 і № 2 была прыпынена. У 2016 г. рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта № 632 ад 10 сакавіка 2016 г. у сувязі з павышаным попытам на спецыялістаў для ўстаноў дашкольнай адукацыі і першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі

сталічнага рэгіена была створана дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мінскі гарадскі педагагічны каледж», супрацоўнікі і навучэнцы якой шануюць і працягваюць традыцыі ССПА сталіцы [9].

У 2021 г. педагагічная супольнасць сталіцы адзначыла 100-годдзе ССПА. Сярод прымеркаваных да гэтай даты падзей можна вылучыць IV Педагагічныя чытанні з міжнародным удзелам «Сярэдняя спецыяльная адукацыя: традыцыі і інавацыі» і ўрачыстае мерапрыемства, што адбылося ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, грамадскіх арганізацый і шэрага ўстаноў адукацыі [1].

Педагогі і навучэнцы Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа надаюць вялікую ўвагу вывучэнню гісторыі ССПА, вынікам чаго стала серыя артыкулаў у навуковых выданнях Беларусі і замежжа, а таксама стварэнне віртуальнага музея Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа [2].

Вопыт афармлення часовай выставы паказвае, што ў Мінскім гарадскім педагагічным каледжы пачынае фарміравацца база крыніц і створаны навукова-метадычныя і метадалагічныя ўмовы для арганізацыі музея гісторыі ССПА сталіцы.

Для падрыхтоўчай работы па арганізацыі дзейнасці музея гісторыі ССПА была створана творчая група з выкладчыкаў і навучэнцаў каледжа. На сенняшні дзень фарміруецца канцэпцыя музея. Плануецца, што ен будзе размяшчацца ў корпусе Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа па адрасе: вул. Якубава, 74.

На думку ўдзельнікаў творчай групы, экспазіцыя музея павінна мець некалькі тэматычных раздзелаў.

Першы раздзел будзе прысвечаны ССПА ў міжваенны перыяд (гісторыі Белпедтэхнікума і педагагічнага вучылішча). У якасці экспанатаў будуць выступаць копіі архіўных дакументаў, фотаздымкі выкладчыкаў і навучэнцаў, матэрыяльнай базы; прадметы, якія дазволяць паказаць паўсядзеннасць навучэнцаў тых часоў (прадметы вопраткі, пасведчанні і інш.). Пры гэтым неабходна ўлічваць, што аўтэнтычныя прадметы для дэманстрацыі знайсці будзе не так проста, бо наступствы Вялікай Айчыннай вайны негатыўна паўплывалі на захаванне такіх гістарычных крыніц.

Другі раздзел будзе прысвечаны развіццю сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінска з 1944 г. па 2004 г. У гэты перыяд з перапынкамі дзейнічала Мінскае педагагічнае вучылішча, якое ў 1982 г. падзялілася на дзве навучальныя ўстановы: педвучылішча № 2 (дашкольная адукацыя) і № 1 (пачатковая адукацыя). У 1998 г. педвучылішчы атрымалі статус каледжа, а ў 2004 г. часова прыпынілі сваю дзейнасць [9].

Дадзеная тэматычная частка мае большы патэнцыял папаўнення арыгінальнымі рэчамі. Гэта могуць быць артыкулы з газет і часопісаў, дакументы

аб навучанні, фотаальбомы былых навучэнцаў вышэйназваных устаноў, канспекты, падручнікі і літаратура, дыдактычныя матэрыялы, якія выкарыстоўваліся на вучэбных занятках і г. д.

Трэцяя частка будзе ахопліваць храналагічны перыяд з 2016 г. па сенняшні дзень. Асновай для яе фарміравання будуць з'яўляцца матэрыялы, звязаныя з дзейнасцю Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа (фотаздымкі, дакументы, узнагароды, памятныя падарункі і інш.).

Асобнае месца ў экспазіцыі плануецца надаць подзвігу педагогаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Архіўныя матэрыялы Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці дазваляюць вызначыць шэраг выкладчыкаў Мінскага педагагічнага вучылішча, якія ў гады вайны знаходзіліся ў войску і прымалі актыўны ўдзел у баявых дзеяннях. Мэтазгодным будзе ўсталяванне сувязі з нашчадкамі такіх выкладчыкаў.

На аснове тэматычных раздзелаў для паспяховай дзейнасці музея распрацоўваюцца наступныя экскурсіі: аглядная экскурсія па музеі, тэматычныя экскурсіі («Сярэдняя спецыяльная педагагічная адукацыя сталіцы ў міжваенны перыяд», «Педагогіка ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Сярэдняя спецыяльная педагагічная адукацыя сталіцы ў 1944–2004 гг.», «Сярэдняя спецыяльная педагагічная адукацыя сталіцы на сучасным этапе»), цыкл «Гісторыя адной рэчы». Плануецца шэраг зменных фотаэкспазіцый з правядзеннем экскурсій.

У 2026 годзе Мінскі гарадскі педагагічны каледж адзначыць сваё дзесяцігоддзе, а сістэма ССПА – 105-годдзе. Да гэтых падзей таксама будуць распрацаваны тэматычныя экспазіцыі і мерапрыемствы.

На аснове пастаяннай і часовых экспазіцый будуць прапанаваны серыі квэстаў, якія ахопяць не толькі музейную, але і гарадскую прастору. Такія заданні прадугледжваюць зваротную сувязь ад наведвальнікаў. Выкарыстанне такіх квэставых заданняў будзе спрыяць актуалізацыі гістарычных і краязнаўчых ведаў у наведвальнікаў музея.

На сенняшні дзень выхаваўчая прастора Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа ўключае ў сябе шэраг праектаў, якія атрымалі шырокую вядомасць не толькі ў самім каледжы, але і па-за яго сценамі. Паспяховая рэалізацыя дадзеных праектаў спрыяе таму, што выкладчыкі і навучэнцы каледжа ўжо ў той ці іншай ступені валодаюць навыкамі і ўменнямі, кампетэнцыямі, а таксама формамі работы, якія неабходны для паспяховай арганізацыі дзейнасці музея гісторыі ССПА.

Такім чынам, у Мінскім гарадскім педагагічным каледжы склаліся перадумовы для стварэння музея гісторыі ССПА сталіцы. Дадзены музей можа стаць новым цэнтрам для рэалізацыі выхаваўчых мерапрыемстваў устаноў адукацыі горада, спрыяць папулярызацыі і пашырэнню ведаў пра гісторыю адукацыі і лакальную гісторыю Мінска, а таксама падтрыманню ў навучэнцаў

ўсвядомленага выбару педагагічнай прафесіі, прывабнасці і станоўчага вобразу прафесіі педагога.

**Крыніцы**


1. 100 непаўторных гадоў… // Издательский дом «Педагогическая пресса». – URL: https://nastgaz.by/100-nepautornyh-gadou/ (дата обращения: 18.11.2024).

2. Виртуальный музей Минского городского педагогического колледжа // Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж». – URL: http://pedkol.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=4091 (дата обращения: 19.11.2024).

3. Глинский, А. А. Феномен воспитательного пространства в современной образовательной практике / А. А. Глинский, Н. Н. Захожая // Выхаванне і дадатковая адукацыя : навукова-метадычны, інфармацыйны часопіс. – 2015. – № 8. – С. 3–8.

4. Инструктивно-методическое письмо «Особенности организации идеологической и воспитательной работы в учреждениях общего среднего образования в 2024/2025 учебном году» // Министерство образования Республики Беларусь. – URL: https://edu.gov.by/molodezhnaya-politika/glavnoe-upravlenie-vospitatelnoy-raboty-i-molodezhnoy-politiki/upravlenie-raboty/informatsiya/informatsionno-analiticheskie-i-metodicheskie-materialy/ (дата обращения: 19.11.2024).

5. Калечиц, И. Л. Музейная педагогика : учеб.-метод. комплекс / И. Л. Калечиц. – Минск : БГПУ, 2022. – 89 с.

6. Минский городской образовательный форум 2024 г. // Государственное учреждение образования «Минский городской институт развития образования». – URL: http://mgiro.minsk.edu.by/main.aspx?guid=201863 (дата обращения: 19.11.2024).

7. Мишина, М. М. Образовательные и воспитательные функции музея / М. М. Мишина // Актуальные проблемы педагогики и психологии : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Москва, 24 марта 2022 г. / Моск. гос. ин-т культуры ; науч. ред. Т. В. Христидис. – М., 2022. – С. 111–117.

8. Музеи учреждений образования формируют у учащихся устойчивый интерес к историко-культурному наследию страны // Министерство образования Республики Беларусь. – URL: https://edu.gov.by/news/muzei-uchrezhdeniy-obrazovaniya-formiruyut-u-uchashchikhsya-ustoychivyy-interes-k-istorikokulturnomu/?sphrase_id=444635 (дата обращения: 18.11.2024).

9. Страницы истории // Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж». – URL: http://pedkol.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=3351 (дата обращения: 19.11.2024).